І. У. Гонтараў

# БНР - САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА БССР

*Разглядаюцца ідэйныя аспекты другой і трэцяй Устаўных грамат БНР.*

У гістарыяграфіі традыцыйна прысутнічае погляд на Беларускую Народную Рэспубліку (БНР) як на буржуазную альтэрнатыву стварэння дзяржаўнасці для беларусаў. Аднак аналіз двух важнейшых дакументаў, заклаўшых нарматыўную базу дзяржаваўтваральных працэсаў у нацыянальнай форме, – другой і трэцяй Устаўных грамат БНР – даюць нечаканы вывад пра сацыялістычную ідэалагічную аснову і гэтай формы беларускай дзяржаўнасці. Згодна з тэкстам другой Устаўной граматы, выдадзенай 9 сакавіка 1918 г., на этнічных тэррыторыях пражывання беларусаў выканаўчы камітэт Рады Першага Усебеларускага з'езда абвяшчаў стварэнне БНР, якая павінна была стаць дэмакратычнай дзяржавай са свабодай слова, выбарчага права і сумлення. Заканадаўчую ўладу атрымала Рада, а выканаўчую – Народны Сакратарыят, які назначаўся Радай і быў адказны перад ёй. Канчатковае рашэнне пытання аб уладзе ў Беларусі перакладалася на абраны ў будучым Устаноўчы сейм, дэлегаты якога выбіраліся на аснове роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права. У пункце 6 другой Устаной граматы шанаваліся правы нацыянальных груп. Па сваей сутнасці БНР магла стаць палітычна левай дзяржавай (сацыялістычнай). У першую чаргу гэта відавочна са спосабаў вырашэння аграрнага пытання. З пункта 7 другой Устаўной граматы вынікала, што прыватная маёмасць на зямлю ліквідавалася, і зямля передавалася без выкупу тым, хто на ёй працуе, а менавіта сялянам. Хаця пытанне пра грамадскую ўласнасць на сродкі вытворчасці не было вызначана. Таксама у 7 пункце дэкларавалася, што “. . . лясы, вазёры і нутро зямлі абвяшчаюцца ўласнасьцю Беларускае Народнае Рэспублікі.” Таксама ў 8 пункце афіцыйна ўсталёўваўся 8-гадзінны рабочы дзень. Другая Устаўная грамата была выдадзена запознена. Брэсцкі мір быў ужо ратыфікаваны. Германія, выконваючы яго артыкулы, не магла прызнаць БНР. Акрамя таго, кіруючыя колы Германіі насцярожвалі палажэнні аб нацыяналізацыі зямлі, азёраў і лясоў. Ва ўмовах ваеннай акупацыі тэрыторыі Беларусі ажыццявіць намеры, выказаныя ў другой Устаўнай грамаце БНР, не ўдалося. Таксама ў ёй не быў вызначаны статус БНР, таму і спатрэбілася трэцяя Устаўная грамата, якая абвяшчала БНР, як незалежную дзяржаву. Такім чынам, у другой і трэцяй Устаўных граматах сцвярджаліся сацыялістычныя прынцыпы. Яны вызначылі асновы дзяржаўнага ладу рэспублікі, яе тэрыторыю, правы і свабоды грамадзян, а таксама формы ўласнасці. Адзін з варыянтаў пячаткі БНР, замоўлены 3 красавіка 1918 г., меў выяву снапа, грабляў і касы, што ўскосна сведчыла пра наяўнасць у часткі палітычных лідараў БНР сацыялістычных поглядаў. Пытанне: “Што першае – сацыялізм ці нацыя?” – гучала і на нарадах Рады БНР. Аднак вызначаны ў трэцяй Устаўной грамаце палітычна-дзяржаўны ідэал у выглядзе незалежнай БНР ва ўмовах германскай акупацыі беларускіх земляў не мог быць рэалізаваны.

### *Спіс літаратуры*

1. Устаўная грамата да народаў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. - 1993. - №4. - С. 71.
2. Устаўная грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі // Беларускі гістарычны часопіс. - 1993. - № 4. - С. 71 -72.

*Гонтараў Ілля Уладзіміравіч*, студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, illfate254@gmail.com.
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by.